




.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
БЭТМЭН
#38 (2011)
ПЕРАКЛАД
І АФАРМЛЕННЕ:
КОЗЫРАЎ СЯРГЕЙ


BATMAN: ENDGAME PART FOUR
WRITER SCOTT SNYDER PENCILLER GREG CAPULLO
INKER DANNY MIKI COLORIST FCO PLASCENCIA
LETTERERS STEVE WANDS AND JARED K. FLETCHER
COVER CAPULLO, MIKI AND PLASCENCIA
VARIANT COVER ANDY KUBERT AND BRAD ANDERSON
FLASH 75TH VARIANT COVER TONY DANIEL AND TOMEU MOREY
AFTER JACK BURNLEY
ASSISTANT EDITOR MATT HUMPHREYS
EDITOR MARK DOYLE
BATMAN CREATED BY BOB KANE
ГЭТЫ РАЁН ЗАВЕЦЦА ФАЎНДРЫ-СКВЕР.
ЁН РАЗМЕШЧАНЫ СЯРОД СТАРОЙ ЧАСТКІ ГОТЭМА, НІЖНЯГА ІСТ-САЙДА, РАЁНА, З ЯКОГА ПАЧАЎСЯ ГЭТЫ ГОРАД.
ДЗЕ ЎПЕРШЫНЮ ГАЛАНДСКІЯ ПАСЯЛЕНЦЫ ПЕРАМАГЛІ МІАГАНІ, ДЗЕ БРЫТАНЦЫ ПЕРАМАГЛІ ІХ.
ГЭТА ЗАЎСЁДЫ БЫЛО МЕСЦА ЗМЕН. КРОЎ, ГВАЛТ І АГОНЬ. БУДЫНКІ ТУТ ЗНАСІЛІ І БУДАВАЛІ ЗНОЎ З ДЗЕСЯТАК РАЗОЎ. НАЎРАД ЦІ ТУТ ЗАСТАЛОСЯ ШТОСЬЦІ, ЧАМУ БОЛЬШ ЗА ПЯЦЬДЗЕСЯТ ГАДОЎ.
АКРАМЯ ГЭТАГА РАЁНА. ФАЎНДРЫ-СКВЕР.
CUSTOM TAILORED
ПА НЕЙКАЙ ПРЫЧЫНЕ ЗА ГЭТЫЯ ГАДЫ МЯСЦОВЫЯ ЖЫХАРЫ ЎЗ'ЯДНАЛІСЯ, КАБ **АБАРАНІЦЬ** ГЭТЫЯ НЕСАМАВІТЫЯ ДАМЫ АД ЗМЯНЕННЯЎ ЧАСУ. КОЖНАМУ БУДЫНКУ БОЛЬШ ЗА ДВЕСЦІ ГАДОЎ.
ТАМУ **ДЖЫМ ГОРДАН** ВЫРАШЫЎ ЖЫЦЬ ТУТ. ГЭТА НЕКРАНУТАЯ ГІСТОРЫЯ. СТАЛАСЦЬ. РАЗВАЖЛІВАСЦЬ...



...ДА СЁННЯШНЯ-
ГА ДНЯ.
ТРЫМАЙСЯ, ДЗЬЮК! Я З ТАБОЙ.
БЭТМЭН!
АЛЕ МЫ ЛЮБІМ ЦЯБЕ, БЭТ...
ДЖЫМ!



ДЖЫМ!
СЮДЫ...
ТЫ... КХА! ПАВІНЕН УБАЧЫЦЬ ГЭТАГА ХЛОПЦА.
ДЖЫМ. НЕ РАЗМАЎЛЯЙ. УСЁ БУДЗЕ Ў ПАРАДКУ.
Я... ПАТРАПІЎ У ЯГО, БЭТМЭН. ГЭТА НЕЙКАЯ БЯЗГЛУЗДЗІЦА. ХЕХ. ПЭЎНА, ЖАРТ... БО ЁН УСТАЎ (КХА) ЁН ПРОСТА ЎСТАЎ (КХА) ЁН ПРОСТА ЎСТАЎ, АЛЕ ГЭТЫ СТРЭЛ, ЁН БЫЎ (КХА) СМЯРЦЕЛЬНЫМ ДЛЯ БЛАЗАНА. Я...
КАЛІ ЛАСКА, ПРОСТА АДПАЧЫВАЙ.
ДЗЬЮК, ВАННАЯ. ТАМ АПТЭЧКА.
...
ДЗЬЮК!


Я ТОЛЬКІ ШТО... МАЕ **БАЦЬКІ**. Я ТОЛЬКІ ШТО ЗРАЗУМЕЎ, ШТО ЯНЫ...
Я ВЕДАЮ. АЛЕ З ІМІ ЎСЁ БУДЗЕ Ў ПАРАДКУ. АБЯЦАЮ, ШТО ЗРАБЛЮ ДЛЯ ГЭТАГА ЎСЁ МАГЧЫМАЕ. АЛЕ МНЕ ТРЭБА, КАБ ТЫ СУПАКОІЎСЯ. ІМ НЕ ТРЭБА НЕВЯЛІКАЯ ДАПАМОГА АД ЦЯБЕ.
ТЫ ДАПАМОЖАШ МНЕ? БУДЗЕШ СЯБРАМ, ДЗЬЮК?
НЕ РАБІ ГЭТАГА... ХЛОПЕЦ.
ЁН ДРЭЭЭЭЭНЫ СЯБАР! **ХАХАХА!**


І ЯМУ ТРЭБА...
THUNK THUNK
УХ!
ВЕДАЮ, ВЕДАЮ. АЛЕ Я Ж НЕ ГРОБАНЫ **ПЯЧОРНЫ** ЧАЛАВЕК.
Я КАЗАЎ СУР'ЁЗНА. ПАКУЛЬ ТЫ ТУТ, ПЯЧОРА ПАД ПАГРОЗАЙ.
ТАК ГУЧЫЦЬ «ДЗЯКУЙ» ПА-АМЕРЫКАНСКІ? ДА ТАГО Ж, У МЯНЕ ЁСЦЬ НАВІНЫ, ЗГОДНА З ЯКІМІ, МНЕ ЛЕПШ БЫЦЬ **ТУТ**.
МЫ ПРАЦЯГВАЛІ ТЭСЦІРАВАЦЬ **ВІРУС**. ЯКОЕ Б РЭЧЫВА НЕ РАБІЛА ШТАМ УСТОЙЛІВЫМ... ЯНО ТАКСАМА ВЫКЛІКАЕ ШТОСЬЦІ НАКШТАЛТ «КЛЕТАЧНАГА ГНІЕННЯ».
ЗНАЧЫЦЬ, ЁН **СМЯРЦЕЛЬНЫ**. ЯКІ ПЕРЫЯД?
ЯШЧЭ НЯ ВЕДАЮ. АЛЕ МАГУ ВЫСВЯТЛІЦЬ.
ГЭЙ. БАЦЬКА КАЖА, ЧАСАМ ТУТ УСЁ СТАНОВІЦЦА ДРЭННА. АЛЕ СКАЖЫ, КАЛІ ЛАСКА, ТУТ ЖА ТАК БЫВАЕ НЕ КОЖНЫ АЎТОРАК?
НЕ. УСЁ ГОРЖ, ДЖУЛІЯ.
У ЦЯБЕ АТРЫМАЕЦЦА.


Я ВЕДАЮ, ТЫ ЗМОЖАШ. ТЫ ВЫРАТУЕШ ІХ. МАІХ БАЦЬКОЎ. УСІХ ІХ. ЯК ТЫ ЗАЎСЁДЫ ГЭТА РОБІШ.
FAMILY FIRST AID KIT GOTHAM MEDICROSS
KREEEEAK
СУПРАВАДЗІ ДЗЬЮКА НА БАЗУ. ПАГЛЯДЗІМ, ШТО ВЫ ЗМОЖАЦЕ ДАВЕДАЦЦА ПРА СМЯРЦЕЛЬНЫЯ ЯКАСЦІ ВІРУСА. І ТРЫМАЙЦЕСЯ ЦІШЭЙ ВАДЫ, НІЖЭЙ ТРАВЫ.
Я БЫ ДАЎ ВАМ ГЛАЙДАР, АЛЕ ЦЯПЕР СЯРОД ІХ ЗАНАДТА МНОГІЯ СА ЗБРОЯЙ. ЯНЫ ЛЕДЗЬ НЕ ЗБІВАЮЦЬ НАС З НЕБА.
ЦІШЭЙ ВАДЫ, НІЖЭЙ ТРАВЫ. МЫ ЯК МЫШЫ Ў ГОТЭМСКАЙ ЦАРКВЕ. А ТЫ?
Я ЗАБЯСПЕЧУ БЯСПЕКУ ДЖЫМУ, А ПОТЫМ ЗНАЙДУ КРЫНІЦУ ЎСЯГО ГЭТАГА.
«КАБ ЗРАБІЦЬ ШТОСЬЦІ НАСТОЛЬКІ ДРЭННАЕ...»


«...ЯМУ ПАТРЭБНА БЫЛА Б ДАПАМОГА».
МІСТАР МЭЛОЎН. МЯНЕ НЕ БЫЛО Ў ГОТЭМЕ ПЯЦЬ ХВІЛІН І ВОСЬ ШТО ЗДАРЫЛАСЯ.
ТЫ АТРЫМАЎ ВЫРАЗЫ КРЫВІ, ЯКІЯ Я ВЫСЛАЎ, АРНІТОЛАГ?
АТРЫМАЎ. І Ў ІХ ЁСЦЬ НЕЙКАЯ РЭГЕНЕРАЦЫЯ. ЯК ТЫ І ПАДАЗРАВАЛ, ЁСЦЬ ПАДАБЕНСТВА З ЛАЗАРАМ, АЛЕ ГЭТА НЕ ЛАЗАР.
ПА-ПЕРШАЕ, Я ПРАВЕРЫЎ ЯМЫ ПА ЎСЯМУ СВЕТУ. НІЯКІХ СТРАТ. І ПА-ДРУГОЕ, ГЭТА РЭЧ, ЯНА **МАЦНЕЕ**. ЗНАЧНА МАЦНЕЕ.
КАЛІ ЛАСКА, СКАЖЫ, ШТО ГЭТЫ ВЫРАЗ... ЁН ЖА НЕ ЯГО?
ДЖЫМ СТРАЛЯЎ У ЯГО І, МЯРКУЮЧЫ ПА РАСПЫЛУ СТРУМЯНЯ, КРОЎ З АРТЭРЫІ. ЁННЕ ПАВІНЕН БЫЎ ПЕРАЖЫЦЬ ГЭТА.
ЯК І МЫ ЎСЕ.
БОЖА, ТЫ ТАМ У НЕБЯСПЕЦЫ.
НЕ...
...Я ПРА ТОЕ, ШТО ПАД ТАБОЙ. **БЯЖЫ!**
СПРАВА НЕ Ў ВІРУСЕ. НЕ ХВАЛЮЙСЯ ЗА МЯНЕ.
НУ, ДОБРА, МАЕ ПРАБАЧЭННІ. СТАРАЯ ЗВЫЧКА.



ЗНАЙДЗІ ШТОСЬЦІ ДЛЯ МЯНЕ. СТРУКТУРА ВІРУСА, ПАРАЎНАЙ ЯЕ З ВЫРАЗАМ КРЫВІ, ЯКІ Я ДАСТАЛЎ.
ВЕДАЮ, ЧОРТ БЯРЫ. **СУАДНЯСІ** РАЗЛАГА-ЮЧЫ ФАКТАР ВІРУСА З РЭГЕНЕРАТЫЎНЫМ ФАКТАРАМ ЯГО КРЫВІ.
...ШУКАЮ. У ВІРУСЕ АДБЫВАЕЦЦА НЕЙКАЕ РАСЛАЖЭННЕ...
ХАХ. ЭЎРЫКА.
ЯНЫ **АДВАРОТНЫ**, ТАК? ШТО Б ЁН НЕ ПРЫМАЎ, ЯКАЯ Б ЧАРТАЎНЯ НІ БЫЛА Ў ЯГО КРЫВІ, ЯНА ДАЕ ЯМУ МАГ-ЧЫМАСЦЬ ВЫЛЕЧВАЦЦА...
...ВІРУС МАЕ АДВАРОТНЫ ШТАМ.
ГЭТА **ПРАЦІЛЕГЛАСЦІ**. ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ. КАМЕДЫЯ І ТРА-ГЕДЫЯ. ЛЮБОЎ І НЯНАВІСЦЬ.
ГЭЙ. НА-ПЕРАДЗЕ ШТОСЬЦІ ЁСЦЬ. ТАБЕ ТРЭБА...
НЕ. МНЕ ТРЭБА, КАБ ТЫ ДАПАМОГ МНЕ ЗНАЙСЦІ **ЛЕКІ**...
...БО КАЛІ Ў МЯНЕ ГЭТА НЕ АТРЫМАЕЦЦА, ПРЫЧЫМ **ХУТКА**, УСЁ БУДЗЕ...


...КАНЕШНЕ.




ХІІХІІ! Я ПЛЮЮ НА ТВАЮ МАГІЛУ.
МІСТАР МЭЛОЎН! ЯНЫ ЗБІРАЮЦЦА...
ЗАХЛОПНІСЬ. СЛУХАЙ УВАЖЛІВА. УХ...
АРКХЭМ. ГЭТА ПАВІНЕН БЫЦЬ КЛЮЧ. ЧАСТКОВА ТАМУ ЁН БЫЎ ТАМ. ХТОСЦІ ЯМУ ДАПАМАГАЎ ТАМ.
«МНЕ Ў ГАЛАВУ ПРЫХОДЗЯЦЬ ТОЛЬКІ ТРЫ НАВУКОЎЦА, ЯКІЯ ЗДОЛЬНЫЯ НА СТВАРЭННЕ НАСТОЛЬКІ МОЦНАГА РЭГЕНЕРАТЫЎНАГА ПРЭПАРАТА, ЯК ТОЕ, ШТО ПРЫМАЕ ДЖОКЕР».
ХАХАХА! ПЛЮЮ!
«УСЕ ТРЫ БЫЛІ ЧАСТКАЙ АДНАГО І ТАГО Ж БІЯЛАГІЧНАГА ПРАЕКТА, ЯКІ СТВАРЫЎ МОЙ ДЗЯДЗЯ, КАЛІ ЁН КІРАВАЎ УЭЙН ЭНТЭРПРАЙЗЫС. ЯГО ЎЗНАЧАЛЬВАЎ **ДОКТАР КАРЛ ХЭЛФЕРН**».
ТАМ! ХУТЧЭЙ!
ХЭЛФЕРН. **ДОКТАР СМЕРЦЬ.**
УХ.
ВЕДАЮ. ЗДАНЬ З МІНУЛАГА.


«ХЭЛФЕРН ПРАЦАВАЎ З КОСТКАМІ. Х'ЮГА СТРЭНД – З РЭГЕНЕРАЦЫЯЙ НЕРВОВАГА РЭЧЫВА. І БЫЎ ТАК САМА ДОКТАР ПОЛ ДЭККЕР, ЯКІ ПРАЦАВАЎ З МЯККІМІ ТКАНІНАМІ».
«КОСТКІ, МОЗГ І ЦЕЛА. ФІЛІП ЗВАЎ ІХ **ДОКТАРСКАЕ ТРЫА**».
«ХАХ. ПОЛ ДЭККЕР? ТАКСАМА ВЯДОМЫ ЯК...»
«ТАК. ХЭЛФЕРН МЁРТВЫ. СТРЭНДЖА НЕ БЫЛО Ў ГОТЭМЕ НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ. ЗАСТАЕЦЦА ДЭККЕР».
ДЗЕЕЕ? КУДЫ ЁН ЗНІК?
«І І СЛУХАЙ ВОСЬ ШТО. ПОЛ ДЭККЕР. ПАЎТАРЫ ГАДЫ НАЗАД УТРЫМЛІВАЎСЯ Ў АРКХЭМЕ. БЫЎ ПЕРАВЕДЗЕНЫ Ў РЭАБІЛІТАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ ПА ЗАГАДУ...»
«ЭРЫКА БОРДЭРА».
БІНГА!
ЁН У ТАНКУ!
ДОБРА. Я АТРЫМАЎ, ШТО ХАЦЕЎ. АЛЕ СЛУХАЙ, ЁСЦЬ НЕШТА, ШТО **ТАБЕ** ТРЭБА ВЕДАЦЬ...
...ДЖОКЕР ВЕДАЕ, ХТО Я.
«...ШТО ТЫ МАЕШ НА ЎВАЗЕ ПАД ГЭТЫМІ СЛОВАМІ?..»
«ЁН ВЕДАЕ».
«ЗНАЧЫЦЬ, УСЁ КОНЧАНА».
ХА ХА ХА ХА ХА ХА ХА!
«ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ... ГЭТА **КАНЕЦ**. ХОПІЦЬ АДЦЯГВАЦЬ. ЎЖО НІЧОГА НЕ ЗРОБІШ».


«МНЕ ЦЯЖКА Ў ГЭТА ПАВЕРЫЦЬ».
«І ЁН ВЕДАЕ, ХТО ТЫ...»
КУУ-КУУ...
«Я НЯ ВЕДАЮ, ЯК З ГЭТЫМ ЗЛАДЗІЦЬ».
«СЛУХАЙ, ГЭТА Я ТУТ ВЕЧНЫ АПТЫМІСТ, АЛЕ ТЫ ПАВІНЕН ПАГЛЯДЗЕЦЬ ПРАЎДЗЕ Ў ВОЧЫ».
«ВІРУС СМЯРЦЕЛЬНЫ. ЁН ЗАХАПІЎ ГОРАД».
«ДЖОКЕРА НЕ ПЕРАМАГЧЫ».
«ВЫХАД ЁСЦЬ ЗАЎСЁДЫ».
«ШТО Ж, ДАЗВОЛЬ НАМ ДАПАМАГЦІ ТАБЕ. БЭТГЁЛ НА СУВЯЗІ. ЧЫРВОНЫ КАЎПАК, ЧЫРВОНЫ РОБІН. Я МАГУ БЫЦЬ ТАМ ПРАЗ ШЭСЦЬ ГАДЗІН».
«НЕ. ПАКУЛЬ ШТО ВАМ УСІМ ТРЭБА ЗАСТАВАЦЦА Ў БЯСПЕЦЫ, ТАМ, ДЗЕ ВЫ ЗАРАЗ».
«НЕ ВЫКЛЮЧАЙ НАС З СВАЙГО ПЛАНА. ПАМЯТАЕШ, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ Ў МІНУЛЫ РАЗ, КАЛІ...»
НЕ ВЫКЛЮЧАЮ, АРНІТОЛАГ. СПРАВА Ў ТЫМ...
...ШТО Ў МЯНЕ ЯШЧЭ НЯМА ПЛАНА.


«...Я НЯ ВЕДАЮ, ШТО РАБІЦЬ».
«ГЭТА НЕВЯДОМЫЯ ВОДЫ».


«БЕССМЯРОТНЫЯ СТВАРЭННІ». КАЖУЦЬ, НЕКАЛЬКІ ТАКІХ ІСНУЮЦЬ У ПРЫРОДЗЕ. ГІДРА. НЕКАТОРЫЯ АМАРЫ РАСТУЦЬ У СВАІХ ПАНЦЫРАХ, АЛЕ ІХ КЛЕТКІ НЕ СТАРЭЮЦЬ.
НІХТО НЕ ВЕДАЕ ГЭТА ЛЕПШ, ЧЫМ ДОКТАР ПОЛ ДЭККЕР. НАРАДЗІЎСЯ Ў СЯМ'І МАСТАКОЎ З НЭРРОЎЗА. БАЦЬКА, МАЦІ, СЯСТРА – УСЕ ЗАГІНУЛІ, КАЛІ Ў БУДЫНКУ ЛОПНУЛА ГАЗАВАЯ ТРУБА.
ЁН ПРЫСВЯЦІЎ СЯБЕ РЭГЕНЕРАТЫЎНАЙ НАВУКЕ. У ПАДПОЛЬНЫХ ЛАБАРАТОРЫЯХ, ЯКІЯ ФІНАНСАВАЛІСЯ МАІМ ДЗЯДЗЕЙ, ЁН ВЫНАЙШОЎ НЕШТА ПАД НАЗВАЙ «ВЫЛЯЧАЛЬНЫ ШВО».
МЕДЫЦЫНСКАЯ НІТКА, ПАКРЫТАЯ КЛЕТАЧНАЙ МАТРЫЦАЙ, ЯКАЯ РОБІЦЬ КЛЕТКІ, ШТО КАНТАКТУЮЦЬ З ЁЙ, УСЕМАГУТНЫМІ, ЯНЫ ВЯРТАЮЦЦА ДА ЭМБРЫЯНАЛЬНАГА, НЕДЫФЕРЭНЦЫРАВАНАМУ СТАНУ.
ГЭТАЯ НІТКА СЦІРАЕ МІНУЛАЕ КЛЕТКІ, АБНАЎЛЯЮЧЫ ЯЕ, ДАЗВАЛЯЮЧЫ ЁЙ СТАЦЬ... ЧЫМ ЗАЎГОДНА.
У СПАЛУЧЭННІ З ДРОБЯЗЗЮ ГЕНАТЭРАПІІ І КАСКАДНЫМІ СІГНАЛАМІ, «БЕЗУЗРОСТАВАЯ» КЛЕТКА ВЯРТАЕЦЦА ДА НОВАГА ЖЫЦЦЯ, НОВАЙ МЭТЫ.
НІТКА, ШТО РАЗБЛЫТВАЕ ЛЁС КЛЕТКІ І СШЫВАЕ ЯЕ ЗНОЎ У НОВЫМ ЗВАР'ЯЦЕЛЫМ НАПРАМКУ. ПЕРАСШЫВАННЕ АСНОЎНЫХ ЖЫЦЦЁВЫХ ПРАЦЭСАЎ ЦЕЛА, ЯК У НЕЙКАГА АДВАРОТНАГА ФРАНКЕНШТЭЙНА.
ЁН, КАНЕШНЕ, ГЕНІЙ.
КАЛІ Б ТОЛЬКІ ЁН НЕ БЫЎ ЗВАР'ЯЦЕЛЫМ.
CLIK


ПАДАБАЕЦЦА МАЯ МЕДУЗА, БЭТМЭН?
TURRITOPSIS DOHRNII. АДЗІНАЯ ЖЫВЁЛІНА, ЯКАЯ САПРАЎДЫ МОЖА **АМАЛАДЗІЦЦА,** КАЛІ ПАЖАДАЕ, ПЕРАТВАРЫЦЦА З МЕДУЗЫ Ў ПАЛІП.
ЯНА ІСНУЕ ПА-ЗА НАТУРАЛЬНЫМ ЖЫЦЦЁВЫМ ЦЫКЛАМ.
ЗУСІМ ЯК **ЁН**.
Я ТУТ ТОЛЬКІ З-ЗА **ВІРУСА**, ДЭККЕР. Я ВЕДАЮ, ШТО ТЫ ДАПАМОГ ЯМУ СТВАРЫЦЬ ЯГО. ШТО ЗА ЧАРТАЎНЮ ТЫ ТУДЫ НАМЯШАЎ...
НАМЯШАЎ?!
СУБСТАНЦЫЯ Ў ЯДРЭ ГЭТАГА ВІРУСА – ГЭТА НЕ ТОЕ, ШТО Я МОГ БЫ СТВАРЫЦЬ У ЛАБАРАТОРЫІ.
ГЭТА ШТОСЬЦІ **ЗНАЧНА** БОЛЬШ СТАРОЕ, ТОЕ, ШТО Я ШУКАЎ УСЁ СВАЁ ЖЫЦЦЁ. ШТОСЬЦІ, ШТО ДЖОКЕР ПАКАЗАЎ МНЕ...
ГОРАД РАЗРЫВАЕЦЦА НА ЧАСТКІ! МІЛЁНЫ ЛЮДЗЕЙ ЗАГІНУЦЬ, КАЛІ ТЫ НЕ СКАЖАШ МНЕ ПРАЎДУ! ШТО БЫ ЁН НІ РАСКАЗВАЎ ТАБЕ ПРА СЯБЕ, ПРА СВАЁ МІНУЛАЕ...
А! РАСПОВЕДЫ ПРА МІНУЛАЕ!



РАЗУМЕЕШ, БЭТМЭН, ДАСЛЕДВАЛЬНІКІ З МАЙГО ШЭРАГУ, МЫ ЯК РАЗ ЛЮБІМ РАЗМОВЫ ПРА МІНУЛАЕ! У РЭШЦЕ РЭШТ, У СТАРАДАЎНІЯ ЧАСЫ БЫЛО СТОЛЬКІ КАЗАК ПРА ТОЕ, ЯК ЧАЛАВЕЧАСКІЯ ЦЕЛЫ РОБЯЦЬ МЕНАВІТА ТОЕ, ШТО МЫ СПРАБУЕМ АД ІХ ДАБІЦЦА!
ВЫЛЕЧВАЮЦЦА ЦУДОЎНЫМ ЧЫНАМ. ВЫТРЫМЛІВАЮЦЬ СТАГОДДЗІ. ПЕРАНОСЯЦЬ СМЕРЦЬ...
...ПАЦЕШНА ТОЕ, ШТО СХЕМА Ў СТАРЫХ ГІСТОРЫЯХ АМАЛЬ ЗАЎСЁДЫ АДНА І ТАЯ Ж. НЕКАТОРАЕ ЦЕЛА СУТЫКАЕЦЦА З ЧЫМСЬЦІ Ў ПРЫРОДНЫМ СВЕЦЕ, НЕЙКІМ АСАБЛІВЫМ РЭЧЫВАМ У ГЛЕБЕ, РАСЛІНЕ ЦІ ВАДЗЕ, І... ПЕРАТВАРАЕЦЦА.
ЗГОДНА ЛЕГЕНДАМ, У ЧАСЫ ГІЛЬГАМЕША З ВАДЫ РАСЛІ РАСЛІНЫ, ЯКІЯ ДАРАВАЛІ АМАЛАЖЭННЕ. РАКА СТЫКС ДАВАЛА НЕПАРАЖАЛЬНАСЦЬ СКУРНАГА ПОЛАГА.
ГЕРАДОТ У ПЯТЫМ СТАГОДДЗІ ДА НАШАЙ ЭРЫ ПІСАЎ ПРА МАКРОБІЮ, ГОРАД, ДЗЕ ТАЕМНАЯ КРЫНІЦА ДАВАЛА АДВЕЧНАЕ ЖЫЦЦЁ.
СТОЛЬКІ ГІСТОРЫЙ У СТОЛЬКІХ КУЛЬТУР, БЭТМЭН. ВЕЛЬМІ ШМАТ, КАБ ІГНАРАВАЦЬ.
ДЭККЕР. ЗА ГЭТЫМ ВАКНОМ ГІНУЦЬ ЛЮДЗІ! А ТЫ РАЗМАЎЛЯЕШ СА МНОЙ ПРА ГРОБАНЫЯ ЛЕГЕНДЫ І...
ГЭТА НЕ ЛЕГЕНДЫ, БЭТМЭН! КЛЮЧЫ ДА ЧАГОСЬЦІ САПРАЎДНАГА!
ХІМІЧНАЯ СУМЕСЬ, ІСНАВАЎШАЯ Ў ПРЫРОДЗЕ КАЛІСЬЦІ ДАЎНО, ШТОСЬЦІ ВЕЛЬМІ РЭДКАЕ, АЛЕ ТОЕ, ШТО ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ПЭЎНЫХ МЕСЦАХ. ШТОСЬЦІ, ЗДОЛЬНАЕ АКТЫВІРАВАЦЬ НЕАБХОДНЫЯ ГЕНЫ...
...ТЫЯ, З ЯКІМІ МЫ БЕСКАНЕЧНА ЭКСПЕРЫМЕНЦІРУЕМ. LIN28. АМФК... МАТРЫЦА, ЯКАЯ КАНТРАЛЮЕ ТОЕ, ЯК НАШЫ ЦЕЛЫ ЧЫНЯЦЬ САМІ СЯБЕ.
Я НАЗВАЎ ЯГО, БЭТМЭН. Я НАЗВАЎ ЯГО ДЫЯНІСІЙ. ТРОХІ НАВУКОВАГА ГУМАРУ, РАЗУМЕЕШ? У ГОНАР ДЫЯНІСА, ГРЭЧАСКАГА БОГА АДРАДЖЭННЯ. СЭРДЦЫ ЎШЫНЫЯ Ў СЦЁГНЫ.
ХЭЛФЕРН І СТРЭНДЖ ЛІЧЫЛІ, ШТО ЯНО З'ЯВІЛАСЯ РАЗАМ З МЕТЭАРЫТАМІ.
АЛЕ Я ЛІЧУ, ШТО ЯНО НАЛЕЖЫЦЬ НАШАЙ ПЛАНЕЦЕ.
ХЕХ. УЖО НЕ ПАДОБНА НА ГІСТОРЫЮ ПРА БЭТМЭНА, ЗГОДНЫ?



«БО ГЭТА НЕ ТАК. ЯНА ПРА ІХ. НОСЬБІТАЎ. І ГОТЭМ».
«ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ СУТЫКНУЛІСЯ З ГЭТАЙ СУБСТАНЦЫЯЙ ВЕЛЬМІ ДАЎНО І ЎСЁ ЯШЧЭ ХОДЗЯЦЬ СЯРОД НАС. Я ЧУЎ НЕКАЛЬГІ ГІСТОРЫЙ ТУТ, У ГОТЭМЕ».
«ЁСЦЬ СЭВІДЖ, АДЗІН З СТАРЭЙШЫХ ЛЮДЗЕЙ. ЁН СУТЫКНУЎСЯ З ГЭТАЙ СУБСТАНЦЫЯЙ У ЯЕ САМАЙ СТАРОЙ ФОРМЕ».
«І ЁСЦЬ ТАКІ ЧАЛАВЕК, ЯК ДЭМАН, ЯКІ ЗАХОЎВАЕ ЦЭЛЫЯ БАСЕЙНЫ З СУБСТАНЦЫЯЙ У ТАЕМНЫХ ЯМАХ ПА ЎСЯМУ СВЕТУ. САПСАВАНУЮ, АЛЕ ПА-СВОЙМУ ЭФЕКТЫЎНУЮ ВАРЫЯЦЫЮ».
«І ЁН. СУВЯЗЬ З ГОТЭМАМ. БЛЕДНЫ ЧАЛАВЕК. ТОЙ, ШТО СМЯЕЦЦА НАД НАМІ. ТОЕ, ШТО СУТЫКНУЎСЯ З ЁЙ НЕЗАДОЎГА ДА ТАГО, ЯК ЗАКЛАЛІ ГОТЭМ».
ХОЧАШ ВЕДАЦЬ САКРЭТ, БЭТМЭН?
ДОЎГІ ЧАС Я ЛІЧЫЎ, ШТО ТЫ – АДЗІН З ІХ. СТАРЭЙ ГОТЭМА. БАРБАТОС. ВОСЬ ЧАМУ Я ЗДЗЯЙСНЯЎ ТЫЯ ЖУДАСНЫЯ РЭЧЫ. СШЫВАЎ ЖЫЦЦЁ ВАР'ЯЦКІМ ЧЫНАМ... ТОЛЬКІ КАБ СУСТРЭЦЦА З ТАБОЙ!
АЛЕ ПОТЫМ Я СУСТРЭЎ ЦЯБЕ І ЗРАЗУМЕЎ... ТЫ ПРОСТА... ЦЕЛА І КРОЎ!
BUDDA BUDDA BUDDA
А? ДЗЕ...


AAAAAAAGH!
ТЫ ЯГО СТВАРЫЎ. ГЭТАТ «ДЫЯНІСІЙ». ТЫ ДАЎ ЯГО ГЭТАМУ МАНЬЯКУ, А ПОТЫМ СТВАРЫЎ З ГРОБАНАЙ ПРАЦІЛЕГЛАСЦІ ВІРУС! ДЗЕ ТЫ ЯГО ХАВАЕШ?
ДЗЕ?!
ТЫ ЎСЁ НЕПРАВІЛЬНА ЗРАЗУМЕЎ! Я СТВАРЫЎ АДЗІНАЧАСНЫЯ ЛЕКІ, ПШЫК, І ЎСЁ! Я Ў ПРЫНЦЫПЕ НЕ ЗДОЛЬНЫ СТВАРЫЦЬ ШТОСЬЦІ, ХАЦЯ Б **ПАДОБНАЕ**.
Я БРАЎ ЯГО АНАЛІЗЫ КРЫВІ І ДАСЛЕДВАЎ ІХ ДЗЯСЯТКІ РАЗОЎ!
СУБСТАНЦЫЯ Ў ВІРУСЕ, ЯНА З **ЯГО**. Я АТРЫМАЎ ЯЕ З ЦЕЛА ДЖОКЕРА... З ЯГО ХРЫБЕТНІКА.
ЯНА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ТОЛЬКІ ПРЫ КАТАСТРАФІЧНЫХ ПАШКОДЖАННЯХ! У АСТАТНІ ЧАС ЯНА НЕЗАЎВАЖНА!
ЗНАЧЫЦЬ, КАЛІ НЕ ТЫ ДАЎ ЯЕ ЯМУ, ТАДЫ ДЗЕ ЁН ЯЕ ЎЗЯЎ?
КАЖЫ!
А Ў ЦЯБЕ НЕ ТАКІ ЎЖО І ДОБРЫ СЛЫХ ДЛЯ КАЖАНА. ЯЕ БОЛЬШ НЯМА, ЯНА ЗНІКЛА ЗА СОТНІ ГАДОЎ! АЛЕ ЯНА ЁСЦЬ **У ІМ**. БО ЁН АДЗІН З ІХ. ЁН УЛАСНЫ ДЫЯНІСІЙСКІ ЧАЛАВЕК ГОТЭМА.
У РЭШЦЕ РЭШТ, ДЫЯНІС БЫЎ ЯШЧЭ І БОГАМ ШАЛЕНСТВА. І ТРАГЕДЫІ. ЧОРТ, ДЫ САМО СЛОВА «ТРАГЕДЫЯ» ПЕРАКЛАДАЕЦЦА З ГРЭЧАСКАГА ЯК «СПЕЎ КАЗЛА», З-ЗА ЎСІХ КАЗЛОЎ, ПРЫНЕСЕНЫХ ЯМУ Ў АХВЯРУ! НЯЎЖО ТЫ НЕ РАЗУМЕЕШ? ГОТЭМ – НАЙВЯЛІКШАЯ АХВЯРА!
ТАМУ, БЭТМЭН, САРДЭЧНА ЗАПРАШАЮ НА АПОШНЮЮ ВАКХАНАЛІЮ!




ГЭТА НЕ СПЫНІЦЬ! АЛЕ ПА МЕНШАЙ МЕРЫ, МОЖНА ЗАНЯЦЬ МЕСЦА Ў ПЕРШЫМ РАДЗЕ, ТАК? **ХАХА**!
БЭТМЭН?
ПАВЯСІ.
БЭТМЭН? **ГЭЙ**!
ПЭННІ-ДВА. ШТО ВЫ ЗНАЙШЛІ?
УСЁ ДРЭННА, БЭТМЭН. ВІРУС. ЯГО ШТАМ МАЦНЕЙ, ЧЫМ МЫ ЛІЧЫЛІ.
ЯКІ ПЕРЫЯД?
...
ЯКІ ПЕРЫЯД?!
ДВАЦЦАЦЬ ЧАТЫРЫ ГАДЗІНЫ. МАБЫЦЬ, МЕНЬШ. ЁН ВЫМЯРАЕЦЦА НЕ ДНЯМІ, А **ГАДЗІНАМІ**.
І... Я ЗАПУСЦІЛА РАСПАЗНАВАННЕ ТВАРА **ДЖОКЕРА** ПА ЎСЁЙ ГІСТОРЫІ ГОТЭМА. ТРАГЕДЫІ. ПРОСТА КАБ ЎПЭЎНІЦЦА, ШТО ЁН НАС ПАДМАНВАЕ. АЛЕ... ЁН ПАЎСЮЛЬ.



ВЫСОКАЯ ВЕРАГОДНАСЦЬ, ШТО ГЭТА ВЫКРУТ, АЛЕ КАЛІ ТАК, ГЭТЫЯ ФОТАЗДЫМКІ - ЛЕПШАЯ ПАДРОБКА, ШТО Я БАЧЫЛА. ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ...
ГЭТА ВЫКРУТ. ПЭЎНА.
ЁН АДЗІН З ІХ, БЭТМЭН! А ХУТКА І Я БУДУ ТАКІМ ЖА!
ШТО...
ДЭККЕР, НЕ ТРЭБА.
ШТО Б ЁН ТАБЕ НЕ ДАЎ, ГЭТА НЕ ТОЕ, ШТО ТЫ ЛІЧЫШ. ЁН БЫ НЕ СТАЎ РЫЗЫКАВАЦЬ ГЭТЫМ!
ТЫ ПАМЫЛЯЕШСЯ, БЭТМЭН! Я НАРЭШЦЕ СТАНУ АДНІМ З ІХ.
МАГЧЫМА, **Я** СТАНУ ГОТЭМСКІМ **БЭТМЭНАМ**. САПРАЎДНЫМ, ХАХА!
SCREEEEEE
EEEEEEEE...


БЭТМЭН... БЭТМЭН, ТЫ ТУТ?
БЭТМЭН?
ГЭТАГА НЕ МОЖА БЫЦЬ. УСЁ НЕ МОЖА ЗАКОНЧЫЦЦА ВОСЬ ТАК. НЕ МОЖА.
ШТО ТЫ ЗБІРАЕШСЯ РАБІЦЬ?
...
ТОЕ, ШТО, ЯК Я ЛІЧЫЎ, НІКОЛІ НЕ ЗРАБЛЮ.


ДОБРА.
ДАВАЙЦЕ ПАГАВАРЫМ ПРА ГІСТОРЫЮ.



СЦЭНАР – ДЖЭЙМС ЦІНІЁН IV
МАЛЮНАК – СЭМ КІТ
КОЛЕР – РОНДА ПАЦЦІСАН
НАНЯСЕННЕ ТЭКСТА – ТРЭВІС ЛЭНХЕМ
БЭТМЭН СТВОРАНЫ БОБАМ КЕЙНАМ
«ВЕНЫ... ВОСЬ ШТО ГЭТА».
«ВЕНЫ, ЯНЫ ВЯДУЦЬ ДА СЭРЦА... СЭРЦА ГОРАДА. ДЗЯКУЮЧЫ ІМ ЁН ТАКІ, ЯКІ ЁСЦЬ. ДЗЯКУЮЧЫ ІМ ЁН ЖЫВЕ».
«КАЛІ ПРЫСЛУХАЦЦА, МОЖНА ПАЧУЦЬ ЯГО СТУК СЭРЦА. ТУК-ТУК... ТУК-ТУК...»
«СЭРЦА ЎСЯГО. Я ЗАЎСЁДЫ ВЕДАЎ, ШТО ЯНО ЎНІЗЕ...»
...І ЦЯПЕР ЁН ПАКАЖА МНЕ ГЭТА.
КЭССІДЗІ, ГЭТА МАШЫНЫ ПРАЯЗДЖАЮЦЬ НАД НАМІ... МЕТРО, ЯНО ЯШЧЭ НІЖЭЙ... НЯМА НІЯКАГА СЭРЦА ПАД ГОТЭМАМ.
ГЭТА НЕ ВЕНА. ГЭТА КАНАВА. ГЭТА ПРОСТА ЗМЫТЫЯ АДКІДЫ ГОРАДА.
ТССС... ВАМ НЕЛЬГА РАЗМАЎЛЯЦЬ.
ХІІІ!
ЦІШЭЙ, МАЛЫШ...
ПАСПРАБУЮ ЎЙСЦІ ЯШЧЭ РАЗ. ПАКУЛЬ БЛАЗАН НАС НЕ ЗАЎВАЖЫЎ. ПАКУЛЬ ЁН НЕ СКАЗАЎ, ЯКАЯ ГІСТОРЫЯ ПРАВІЛЬНАЯ. ПАКУЛЬ ЁН НЕ СКАЗАЎ, ХТО ЁН НА САМОЙ СПРАВЕ.
ЁН РАЗЗЛУЕЦЦА, КАЛІ ЦЯБЕ ТАМ НЕ БУДЗЕ.
НЕЛЬГА ЗЛАВАЦЬ БЛАЗАНА.


НЕ! Я НЕ БУДУ ГУЛЯЦЬ У ВАШЫ ГУЛЬНІ. КЭССІДЗІ, **СЛУХАЙ** МЯНЕ. Я ТРЫ ГОДА БЫЛА ТВАІМ ДОКТАРАМ.
МЫ ПРАЙШЛІ ПРАЗ ГЭТА. ПАД ГОТЭМАМ НІЧОГА НЯМА... ТОЕ, ШТО ЗДАРЫЛАСЯ З ТАБОЙ У АРМІІ...
НЕ! ЯШЧЭ РАНА. ЁН РАСКАЖА **СВАЮ** ГІСТОРЫЮ. КАЛІ ЎБАЧЫЦЬ СВОЙ ЗНАК.
К-КЭССІДЗІ?
Я ВЕДАЎ... Я ЗАЎСЁДЫ ГЭТА ВЕДАЎ.
HEART
ЧАС. ЧАС ВАМ ДАВЕДАЦЦА ПРАЎДЫ.
ТАЙНУЮ ГІСТОРЫЮ ЎСЯГО ГЭТАГА.


«АЛЕ БЫЛО ГОРАЧА. ТАК ГОРАЧА, ЯК НІКОЛІ РАНЕЙ».
«НАМ НЕЛЬГА БЫЛО РАСКАЗВАЦЬ АДЗІН АДНАМУ ШМАТ ПРА ТОЕ, ХТО МЫ. МЫ СПРАБАВАЛІ ПРЫДУМАЦЬ КОДАВЫЯ ІМЁНЫ Ў ЗАЛЕЖНАСЦІ АД ТАГО, АДКУЛЬ МЫ».
«АДНАК МЫ ЎСЕ БЫЛІ З ГОТЭМА».
ЯНЫ Б НЕ СКАЗАЛІ, У ЧЫМ СКЛАДАЕЦЦА МІССІЯ. НІХТО З НАС НЕ ВЕДАЎ. НЕ МАГУ НАВАТ СКАЗАЦЬ, ДЗЕ МЫ БЫЛІ. ЯНЫ ХАЦЕЛІ, КАБ УСЁ БЫЛО ТАК.
CLICK
CLICK
«Я Б СКАЗАЎ, ГЭТА БЫЛО ШТОСЬЦІ ПАДОБНАЕ НА ВЫПРАБАВАННІ, ХОЦЬ МЫ І НЕ ЗНАЙШЛІ ТОЕ, ЧАГО ЯНЫ ХАЦЕЛІ... АЛЕ Я ЗНАЙШОЎ ШТОСЬЦІ ЛЕПШАЕ. УЦІСНУТАЕ Ў КАМЯНІ».
«ТАДЫ Я І ЗРАЗУМЕЎ, ДА ЧАГО НАС РЫХТАВАЛІ».
«КАЛІ МЫ ВЯРНУЛІСЯ НА БАЗУ, Я ЎЛЕЗ У БАЗУ ДАДЗЕНЫХ... Я ШУКАЎ... І ЗНАЙШОЎ. ЯНО НЕ АДЧЫНЯЛАСЯ, АЛЕ МНЕ НЕ ТРЭБА БЫЛО ЧЫТАЦЬ. ГЭТА ЎСЁ ДАКАЗВАЛА».
BATMAN--FILE CLASSIFIED
«БЭТМЭН. НАС ТРЭНІРАВАЛІ БЫЦЬ БЭТМЭНАМ».
«Я РАСКАЗАЎ ІМ, АБ ЧЫМ ДАВЕДАЎСЯ, І ЯНЫ ПРЫКІНУЛІСЯ, ШТО СМЯЮЦЦА З МЯНЕ. СКАЗАЛІ, ЗРАЗУМЕЛА, У ІХ ЁСЦЬ СПРАВА НА БЭТМЭНА».
«АЛЕ ЯНЫ ВЕДАЛІ, ШТО Я ВЕДАЎ, І ВЫКІНУЛІ МЯНЕ».


«ТАДЫ Я ПАЧАЎ ШУКАЦЬ. ПАЧАЎ ЗАПРОШВАЦЬ ДАКУМЕНТЫ... УСЁ ПАЧАЛОСЯ З НУЛЯВОГА ГОДА... Я ЗНАЙШОЎ ТЫЯ ДАКУМЕНТЫ... САЛДАТЫ, ЯКІЯ РУХАЛІСЯ ПАД ГОРАДАМ. ІХ МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ БЫЛО ЗАСАКРЭЧАНА... ШТО ЯНЫ РАБІЛІ – ТАКСАМА... АЛЕ СЛОВА БЭТМЭН... ШЭСЦЬ РАЗОЎ НА ДАКУМЕНТ».
«ЯНЫ БЫЛІ ПЕРШЫМІ».
«І РЭКАНСТРУКЦЫЯ... ВЫ ВЕДАЛІ, ШТО ЎЛАДАМ ПАТРЭБНЫ БЫЛІ **ВАЙСКОВЫЯ** ПАСТАЎШЧЫКІ, КАБ НАНОВА АДБУДАВАЦЬ МЕТРО І АДНАВІЦЬ ЭНЭРГАСЕЦЬ?»
«ВОСЬ ДЗЕ ЯНЫ БЫЛІ... АРМІЯ БЭТМЭНАЎ... ВОСЬ ЧАМУ ЗДАЕЦЦА, ШТО ЁН ПАЎСЮЛЬ. ВОСЬ ЧАМУ АД ЯГО НЕ ЎЙСЦІ».
TAT RAT RAT TAT TAT TAT TAT
«ІХ ДЗЯСЯТКІ... МОЖА, СОТНІ. УСЕ ЖЫВУЦЬ У БАРАКАХ».
«ЯНЫ ПАТРЭБНЫ, КАБ МЫ БАЯЛІСЯ. КАБ ПАДПАРАДКОЎВАЛІСЯ. КАБ МЫ НЕ РАБІЛІ ТАГО, ШТО **НА САМОЙ СПРАВЕ** ХАЦІМ».
CLICK
CHOKE
ДУМАЕЦЕ, ГЭТА ДОБРА?! **ВЫ ХОЧАЦЕ, КАБ У ЎРАДА БЫЛА ТАКАЯ ЎЛАДА**?!
Я ПАЙШОЎ З УСІМ ГЭТЫМ У ГАЗЕТЫ... І ЯНЫ СМЯЯЛІСЯ З МЯНЕ! **НА САМОЙ СПРАВЕ СМЯЯЛІСЯ**! УСЁ БЫЛО **ПРАМА** Ў ДАКУМЕНТАХ...
«І МНЕ ПРЫЙШЛОСЯ СТАЦЬ АДНЫМ З ІХ. Я НАВАТ АПРАНУЎСЯ... ТОЛЬКІ КАБ ПАКАЗАЦЬ ІМ, ШТО Я МАГУ ІМ БЫЦЬ. ЯК ЛЁГКА ВЫГЛЯДАЦЬ, ЯК АДЗІН З ІХ».



«ЯНЫ СУПРАЦОЎНІЧАЛІ З УЭЙН ЭНТЭРПРАЙЗІС, АЛЕ МЫ **ЎСЕ** ВЕДАЕМ, ШТО ЯНЫ БЫЛІ ПАСТАЎШЧЫКАМІ ДЛЯ АРМІІ ШМАТ ГАДОЎ. ДА НУЛЯВОГА ГОДА. ПОТЫМ ЯНЫ ЦАЛКАМ АДМОВІЛІСЯ АД ІХ».
«ЯНЫ НЕ ХАЦЕЛІ, КАБ ХТО-НЕБУДЗЬ ДАВЕДАЎСЯ... АЛЕ ІСЦІНА ВІДАВОЧНА».
«ЯНА БЫЛА ТУТ, **ПРАМА Ў ДАКУМЕНТАХ**. ЯНЫ БУДАВАЛІ БАЗУ. ЯНЫБУДАВАЛІ ПАД ГОРАДАМ ТАЕМНЫ АПЕРАЦЫЙНЫ ЦЭНТР».
click
BLAM
«ЯНЫ ПРАСОЧВАЮЦЦА ПРАЗ УРАДАВЫЯ БУДЫНКІ... У ГОРАДЗЕ ІХ СОТНІ. Я **ЛІЧЫЎ**».
RAT RAT TAT
RAT RAT RAT TAT TAT TAT
BUDDA BUDDA BUDDA BUDDA
«МНЕ ПРЫЙШЛОСЯ ЎДАРЫЦЬ ЯГО. МНЕ **ПРЫЙШЛОСЯ**. І Я НЕ ПЕРАСТАВАЎ ЯГО БІЦЬ... МНЕ Б НІХТО НЕ ПАВЕРЫЎ. ГЭТА БЫЛО **ТАК ВІДАВОЧНА**, АЛЕ НІХТО Б НЕ ПАВЕРЫЎ...»
SMACK SMACK SMACK
SPLAT SPLAT SPLAT SPLAT
«СУПАКОЙСЯ, КЭССІДЗІ...»
«МЫ КАЗАЛІ ПРА ТОЕ, ЯК ТАБЕ БЫЛО ДРЭННА, ЯК ТЫ НАШКОДЗІЎ ТАМУ ЧАЛАВЕКУ».
«НЕ! БОЛЬШ НЕ!»


«КАЛІ ЁН ПРЫЙШОЎ... УСЯ ВАША ХЛУСНЯ... ВЫ ЎСЁ КАЗАЛІ, ШТО ГЭТА ЎСЁ НЯПРАЎДА... ШТО ЎСЁ ПРАЙШЛО».
«КАНЕШНЕ, МНЕ БЫЛО ЦІКАВА... МНЕ БЫЛО ЦІКАВА, ЯКАЯ РОЛЯ ДЖОКЕРА ВА ЎСІМ ГЭТЫМ...»
ВЕДАЕШ, ТЫ АМАЛЬ ЗНАЙШОЎ МЯНЕ... ТАДЫ, У ПУСТЭЛЬНІ.
ХТО ТУТ...
ВЕДАЕШ, ХТО Я, СЫНОК?
Я НЕ ЗАЎСЁДЫ БЫЎ ТАКІМ... Я БЫЎ ПЕРШЫМ З ІХ... Я БЫЎ ЛЕПШЫМ. ПАКУЛЬ НЕ ДАВЕДАЎСЯ ПРАЎДЫ. ПАКУЛЬ НЕ ЗРАЗУМЕЎ ЖАРТ.
МНЕ ПРЫШЛОСЯ СТАЦЬ ЧЫМСЬЦІ ІНШЫМ. ЧЫМСЬЦІ, ШТО МОЖА НАВОДЗІЦЬ БОЛЬШ СТРАХА. СТРАХА БЭТМЭНА. СТРАХА СІСТЭМЫ. МНЕ ПРЫЙШЛОСЯ СІЛАЙ ПРЫМУСІЦЬ ГОРАД УБАЧЫЦЬ, ЧЫМ ЁН СТАНОВІЦЦА.
МНЕ ПРЫЙШЛОСЯ ЗЛАДЗІЦЬ ІМ ЭМАЦЫЯНАЛЬНАЕ ЎЗВАРУШЭННЕ, КАБ ВЯРНУЦЬ ІХ ДА ЖЫЦЦЯ. МНЕ ПРЫЙШЛОСЯ ПРЫМУСІЦЬ ІХ СМЯЯЦЦА.
Я СТАЎ ІХ Д'ЯБЛАМ... ПРОЦІЛЕГАСЦЮ ІХ ЗМРОЧНАЙ ВАЙНЫ ЗА МОЙ ГОРАД. ІХ ДЖОКЕРАМ.
«Я ЎЦЁК ДАЛЁКА-ДАЛЁКА... І ЯНЫ АДПРАВІЛІ АТРАД, НАСТУПНУЮ ГРУПУ РЭКРУТАЎ, КАБ ПРАВЕРЫЦЬ, ЦІ ГАТОВЫ ЯНЫ ДАЛУЧЫЦЦА ДА ВАЙНЫ».
«МНЕ З ЦЯЖКАСЦЮ АТРЫМАЛАСЯ ЎЦЯКЧЫ... АЛЕ Я ЧУЎ... Я ЧУЎ, ЯК ТЫ ЗНАЙШОЎ МОЙ АПОШНІ БЭТАРАНГ. ТАК Я ЗРАЗУМЕЎ, ШТО ТЫ ПАВЕРЫШ МНЕ. НІХТО ІНШЫ НЕ ПАВЕРЫЎ БЫ. ЯНЫ БАЧЫЛІ Ў МЯНЕ ДОЛЬКІ ЗЛОДЗЕЯ. АЛЕ ГЭТА ЗУСІМ НЕ ТОЕ, ПРА ШТО ГЭТА ГІСТОРЫЯ».
ВЕДАЕШ, Я САМ ТУТ БЫЎ. Я РАСКАЗВАЎ ГЭТУЮ ГІСТОРЫЮ. АЛЕ ЛЮДЗІ Ў АРКХЭМЕ – ГЭТА ТОЛЬКІ ЯШЧЭ АДНА ЧАСТКА ЗМОВЫ.
НІХТО НЕ ХОЧА ВЕРЫЦЬ У ПРАЎДУ, КЭССІДЗІ, РАЗУМЕЕШ? ВОСЬ У ЧЫМ ЖАРТ.
О БОЖА... О БОЖА...



ТЫ... ТЫ **ДЖОКЕР**.
«Я ДАПАМОГ ІМ ПАБУДАВАЦЬ ІХ ГОРАД. Я ЛІЧЫЎ, ЯНЫ СПРАБУЮЦЬ НЕВЕСЦІ ПАРАДАК. СПРАБУЮЦЬ ЗРАБІЦЬ ШТОСЬЦІ ПРАВІЛЬНАЕ... АЛЕ СТАНАВІЛАСЯ ЎСЁ ГОРШ. З КОЖНЫМ ДНЁМ».
«ЯНЫ ШТОСЬЦІ ДАДАВАЛІ Ў ВОДУ... РАБІЛІ ЛЮДЗЕЙ БОЛЬШ **ЗГОДЛІВЫМІ**. ЯНЫ ХАЦЕЛІ ЎСІМ **КІРАВАЦЬ**. ЗАГЛУШЫЦЬ ЭМОЦЫІ, КАБ ЛЮДЗІ БОЛЬШ НЕ МАГЛІ ДУМАЦЬ. КАБ УСЕ СТАЛІ ІХ ДРОНАМІ».
CLICK
«АЛЕ З'ЯВІЛІСЯ **ЯНЫ**. ЯНЫ ЎСЕ. І ЯНЫ СПЫНІЛІ МЯНЕ».
АЛЕ Я ЗБІРАЮСЯ ПАКОНЧЫЦЬ З УСІМ ГЭТЫМ. І МНЕ ПАТРЭБНА ТВАЯ ДАПАМОГА. МНЕ ТРЭБА, КАБ ТЫ РАСКАЗАЎ ГЭТУЮ ГІСТОРЫЮ.
ЁСЦЬ І ІНШЫЯ ГІСТОРЫІ, АЛЕ ГЭТА САПРАЎДНАЯ.
ЯНА ЎНІЗЕ, САПРАЎДЫ? БАЗА... БАЗА І ЯНЫ ЎСЕ...
ТАК. І МНЕ ТРЭБА, КАБ ТЫ ТУДЫ ПАЙШОЎ. ЗАЙШОЎ ГЛЫБЕЙ СЭРЦА...


ГЭТА НЯПРАЎДА... ЧАМУ НІХТО З ВАС НЕ РАЗУМЕЕ, ШТО ЎСЕ ГЭТЫЯ ГІСТОРЫІ - НЯПРАЎДА? ЯМУ ПРОСТА ТРЭБА, КАБ ВЫ ТАК ДУМАЛІ.
ЁН КАРЫСТАЕЦЦА ВАМІ!
ЗА ГЭТЫМІ ДЗВЯРМІ НІЧОГА НЯМА! ГЭТА ПРОСТА СЛУЖБОВЫ ШЛЯХ НАЗАД НА ПАВЕРХНЮ!
НЯМА НІЯКАЙ ТАЕМНАЙ ВАЙСКАВОЙ БАЗЫ! НЯМА НІЯКАЙ ЗАМОВЫ БЭТМЭНАЎ!
ВЫ... ЧУЕЦЕ ГЭТА?
ПАДОБНА НА СМЕХ...
У ВАС СВАЕ ГІСТОРЫІ, ДОКТАР...
...У НАС - СВАЕ.
ЁООН... ЯГО...
ГАТОВЫ НАС АШЧАСЛІВІЦЬ... НАРЭШЦЕ...
ГАТОВЫ ЗАМЯНІЦЬ НАС ЧЫМСЬЦІ ЛЕПШЫМ...
ВЫ ГАТОВЫ, ДОКТАР?
ВЫ ГАТОВЫ ДАВЕДАЦЦА ПРАЎДЫ?
END
for NOW